ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
15
кастрычніка
чацвер

№ 26(1547)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
## ТЭЛЕТАЙП
«УЧОРА - СЁННЯ - ЗАЎТРА»

### СУСТРЭЧА

студэнтаў і выкладчыкаў з народным артыстам СССР Вячаславам Ціханавым прайшла ў актавай зале універсітэта. Добра вядомы гледачам па фільмах «Смага», «Справа была ў Пянькове», «Белы Бім Чорнае вуха», «Фронт без флангаў», «Семнаццаць імгненняў вясны» кінаакцёр падзяліўся з удзельнікамі сустрэчы сваімі думкамі аб складаным і цяжкім працэсе перабудовы ў нашым кінематографе, аб стужках, у якіх здымаецца цяпер, аб рабоце на «Беларусьфільме».

В. ВІКТАРАЎ.

### ПА ЗАПРАШЭННЮ

арганізацыйнага камітэта Дзён радыёфізікі ў БДУ імя У. І. Леніна былі ў гасцях нашы студэнты — удзельнікі групы палітычнай песні «Салітон» фізічнага факультэта Сафійскага універсітэта. Камітэт ДКМС вельмі ўдзячны за цёплы, сардэчны прыём і сяброўскую сустрэчу. На наш погляд, такая новая форма супрацоўніцтва заслугоўвае ўвагі, і мы гатовы пашыраць і паглыбляць культурны абмен паміж нашымі універсітэтамі.

В. ГЕОРГІЕВА.

### ВЫСТАЎКУ-ПРОДАЖ

да пачатку навучальнага года ў ВНУ і тэхнікумах мяркуе правесці магазін «Навукова-тэхнічная кніга». Пакупнікоў чакае шырокі выбар вучэбнай і даведачнай літаратуры па радыёэлектроніцы і вылічальнай тэхніцы, фізіцы і матэматыцы, прыладаі машынабудаванню.

Вучэбны дапаможнік «Курсавыя работы па рускай мове» спатрэбіцца студэнтам - філолагам. Дапаможнік «Курс алгебры і тэорыі лічбаў у задачах і практыкаваннях» прызначаецца для студэнтаў малодшых курсаў, таму доказ кожнай тэарэмы вядзецца па частках. Кнігі выпушчаны ў свет выдавецтвам «Вышэйшая школа».

Г. ХІТРЫК.

***РАБОТНІКІ ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ! ПАСЛЯДОЎНА АЖЫЦЦЯЎЛЯЙЦЕ ПЕРАБУДОВУ АДУКАЦЫІ! УМАЦОЎВАЙЦЕ СУВЯЗЬ ВУЧОБЫ З ЖЫЦЦЁМ, ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ТРЫВАЛЫЯ ВЕДЫ НАВУЧЭНЦАЎ І СТУДЭНТАЎ!***

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).*

НА ПЕРАДАВЫХ РУБЯЖАХ

## Рэлятывісты раяцца

У БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА адбылася рабочая нарада «Гравітацыя і электрамагнетызм». Восьмы раз сталіца Беларусі гасцінна сустракае спецыялістаў-рэлятывістаў з многіх навуковых цэнтраў краіны.

Такі вялікі давер да рэлятывістаў Белдзяржуніверсітэта, вядома, звязаны з навуковымі дасягненнямі групы рэлятывістаў кафедры тэарэтычнай фізікі. З 1976 года кафедра прызнана вядучай па праблеме «Гравітацыя і электрамагнетызм» секцыяй гравітацыі НТС МінВНУ СССР, каардынуючы ўсе работы ў гэтым напрамку. Рэлятывісты БДУ ўжо каля 20 гадоў маюць дагавор аб навуковым супрацоўніцтве з вучонымі Йенскага універсітэта імя Ф. Шылера (ГДР).

Поспехі групы бясспрэчныя. Гэта і пастаянныя абароны дысертацый супрацоўнікамі і аспірантамі кафедры, і публікацыі артыкулаў у самых аўтарытэтных навуковых часопісах краіны і свету, і выданне манаграфій і метадычных дапаможнікаў. Дацэнт кафедры А. К. Гарбацэвіч абараняў дысертацыю ў Йенскім універсітэце, прадстаўнікі розных краін — В'етнама, ГДР, Бурундзі — абаранялі дысертацыі пад навуковым кіраўніцтвам рэлятывістаў Белдзяржуніверсітэта. Паспяхова завяршае работу над дысертацыяй аспірант з Венесуэлы В. Вільяльба. Яго абарона, як, дарэчы, і шэрагу іншых аспірантаў кафедры, плануецца датэрмінова.

Зразумела, што прызнанне поспехаў радуе, але гэта накладвае і дадатковыя абавязкі. Напрыклад, у адпаведнасці з загадам МінВНУ СССР рэлятывісты універсітэта штогод выдаюць міжведамасны зборнік навуковых прац. У лістападзе выйдзе зборнік за 1986 год, а мы ўжо рыхтуемся да выдання наступнага.

Нас заўсёды радуюць сустрэчы з калегамі. Вось і сёлета з цікавымі дакладамі па самых актуальных праблемах нашай тэматыкі прыехалі прафесары М. У. Міцкевіч (Універсітэт Дружбы Народаў імя П. Лумумбы), Ю. С. Уладзіміраў (МДУ), прадстаўнікі Тарту, Дубна, Краснаярска, Львова, Бранска, Йашкар-Алы і іншых цэнтраў краіны. Усяго на нарадзе было заслухана каля 60 дакладаў, у тым ліку дзевяць падрыхтавалі рэлятывісты нашага універсітэта.

Нарада паказала, што інтарэсы рэлятывістаў вельмі шырокія. Гэта і новыя матэматычныя метады, і пабудова новых альтэрнатыў тэорыі, і прыкладныя праблемы, і праблемы на стыку розных навук, напрыклад, на стыку квантавай тэорыі і тэорыі гравітацыі.

З году ў год пашыраецца фронт работ па гравітацыі і электрамагнетызму. Рэлятывісты кафедры тэарэтычнай фізікі зробяць усё магчымае, каб заставацца на перадавых рубяжах гэтага напрамку.

Г. ШЫШКІН,
дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі.

## Знаёмцеся: Наталля КАЎТУР



Сканцэнтраваны погляд, прыўзнятыя ад нецярпення плечыкі, складзеныя разам рукі. Што так захапіла Наталлю? Здаецца, ужо ўсё добра ведае, даўным-даўно прывыкла да лекцый, семінараў, лабараторных, а тут нават і пра фотакарэспандэнта забылася. А можа, так яно і павіна быць: калі нават пасля званка на перапынак студэнт гатовы слухаць выкладчыка, бо верыць кожнаму яго слову?

Сёння перабудова адбываецца ва ўсім нашым жыцці. Не можа яна не закрануць і вышэйшую школу. І ў гэтых умовах вельмі важна, каб кожны чалавек, каму даверана справа вучыць другіх, гаварыў з імі праўдзіва і шчыра. Тады аўдыторыя будзе рэагаваць гэтак жа, як студэнтка III курса ФПМ Наташа Каўтур, толькі тады пасеянае ў час вучобы зерне прарасце ў вучнях добрымі, справядлівымі ўчынкамі.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

РЭХА ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

## «Бульба»— без кампрамісаў

ЗРАЗУМЕЛА, з кожнага правіла ёсць выключэнне. Але тут іх чамусьці асабліва многа. І не стыхійна ж больш 120 тысяч студэнтаў ВНУ, навучэнцаў тэхнікумаў і вучылішчаў штогод выязджаюць увосень убіраць ураджай у калгасы і саўгасы — АРГАНІЗАВАНА. Толькі, глядзіш, там у атрадзе з харчаваннем не ўсё ў парадку, тут — пасцельных рэчаў па камплекце на тры чалавекі выдалі, а ў іншай гаспадарцы і зусім не гатовы да прыёму студэнтаў. Значыць, недапрацоўваюць тыя, хто яшчэ зімой пачынае займацца арганізацыяй асенніх студэнцкіх сельгасатрадаў? Ці ёсць іншыя прычыны, якія нараджаюць шматлікія праблемы ў гэтых атрадах? Мяркуйце самі.

У калгасе «Камуніст» Чавускага раёна атрад першакурснікаў механіка-матэматычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна працуе, як гаворыцца, з раніцы да позняга вечара, нават абеды рабятам у поле прывозяць. Працуюць без выхадных, пры любым надвор'і. Зрэшты, гэта не зусім так. Нярэдка даводзіцца на полі і гультаяваць — тым, хто працуе на бульбаўборачных камбайнах,— тэхніка іншы раз выходзіць са строю.

І ўсё-такі мне пашанцавала: гэта быў адзін з нямногіх асенніх атрадаў, які жыве ў інтэрнаце. Праўда, як хутка ўдалося пераканацца, інтэрнат быў не з лепшых. Шчыліны ў сценах, вялікія дзіркі ў падлозе... Пернікі тут на стале не пакідалі — у доме ёсць мышы. Калі хлопцам станавілася занадта халадна, дзяўчаты адчынялі дзверы свайго пакоя, каб з яго ад адзінай, якая дзейнічала, печы хоць крыху нацягнула цёплага паветра ў пакой рабят. Сушылі вопратку тут жа, на спінках ложкаў. Тут жа ляжалі хворыя. «Неяк умудраемся хварэць па чарзе. Дзіўна, чаму не ўсе адразу?..» — пацiскалі плячыма студэнты.

У гаспадарках, якія штогод прымаюць СА, павінны быць добрыя стацыянарныя базы. Амаль ці не ва ўсіх дакументах, якія датычаць арганізацыі студэнцкіх сельгасработ, запісана: толькі «ў парадку выключэння дапускаецца размяшчэнне лінейнага атрада ў некалькіх лагерах у аддзяленні аднаго саўгаса, калгаса». «А ў нас пакуль у 24 гаспадарках раёна,— гаворыць камандзір Чавускага занальнага штаба СА Дзмітрый Мядзведзеў,— толькі тры такія, як у «Камунісце», баракі». Вось ужо, праўда, баракі — інакш не назавеш.

Я спецыяльна апускаю тое, аб чым гаварылі мне ў кожным атрадзе: аб адсутнасці спецвопраткі, аб аднастайнасці харчавання, аб зрэдку паказваемых у сельскім клубе стужках.

З пастановы Дзяржаўнага камітэта СССР па працы і сацыяльных пытаннях, Дзяржаграпрома СССР, сакратарыята Усесаюзнага Цэнтральнага Савета Прафсаюзаў ад 10 жніўня 1987 года:

«Наладзіць строгі кантроль за захаваннем у гаспадарцы неабходных умоў для высокапрадукцыйнай працы і адпачынку студэнтаў і навучэнцаў, забеспячэннем іх неабходнымі спраўнымі механізмамі і інвентаром, звярнуўшы асаблівую ўвагу на стварэнне небяспечных умоў працы, строгае выкананне рэжыму рабочага часу і часу адпачынку, забеспячэнне студэнтаў і навучэнцаў неабходнай спецвопраткай, спецабуткам і іншымі сродкамі індывідуальнай аховы».

Гэта патрабаванне — да Дзяржаграпромаў саюзных рэспублік, саветаў і камітэтаў прафсаюзаў. А цяпер давайце кампетэнтна, з веданнем таго, наколькі «рэальна» іншыя пункты гэтага патрабавання ажыццёўлены, скажам: далёка не ва ўсіх гаспадарках, не ў кожнай арганізацыі першачарговы, важнейшы клопат — клопат пра чалавека. Бывае, што выражаецца ён яшчэ і такім чынам. У адным калгасе Магілёўскай вобласці старшыня паабяцаў студэнтам: «Скончыце убіраць бульбу 5 кастрычніка — атрымаеце прэмію 200 рублёў, шостага — 100 рублёў, ну, а сёмага — ужо ні рубля не дам». Надрываліся рабяты ў полі да ночы, але паспелі ўсё ж да шостага.

Так, сёння галоўная наша агульная задача — сабраць ураджай з найменшымі стратамі. Ад гэтай справы не можа быць у баку ні школьнік, ні студэнт, ні рабочы. Так, можна ад нечага адмовіцца ў малым, не заўважаць нейкія цяжкасці — у рэшце для сябе ж убіраем з палёў бульбу, гародніну. Але мы не можам забываць пра тое, што ніякія цэнтнеры і тоны сабранага ўраджаю не аплацяць куды большай страты — чалавечага здароўя, працаздольнасці. Ды і што, уласна, выйграем мы, калі на полі замест трыццаці байцоў студэнцкага атрада працуе пятнаццаць, якія яшчэ не паспелі захварэць?

Г. ВІТКОЎСКАЯ.

## А ТЫ ПАДПІСАЎСЯ?

# Што новае ў навуковых колах?

НА ГЭТА пытанне вам на працягу года будзе даваць адказ навукова-тэарэтычны часопіс «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна».

Часопіс друкуе тэарэтыка-метадалагічныя і аглядныя артыкулы па фізіцы, матэматыцы, механіцы, хіміі, біялогіі, геаграфіі, арыгінальныя работы па выніках важнейшых эксперыментаў у галіне фундаментальных і прыкладных навук. На старонках «Весніка» знаходзяць шырокае адлюстраванне пытанні літаратуразнаўства, моваэнаўства, журналістыкі, педагогікі, псіхалогіі, чытачы сістэматычна знаёмяцца з важнейшымі дасягненнямі беларускіх вучоных у названых галінах навукі.

БДУ імя У. І. Леніна пастаянна падтрымлівае трывалыя навуковыя сувязі з многімі ВНУ краіны, з універсітэтамі сацыялістычных краін. Нямала артыкулаў прысвячаецца сумесным даследаванням з вучонымі іншых навуковых цэнтраў.

У верасні часопіс экспанаваўся на VI Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы. Асаблівую цікавасць публікацыі па прыродазнаўчых навуках выклікалі ў прадстаўнікоў фірм ЗША, Вялікабрытаніі, ФРГ, Нідэрландаў, сацыялістычных краін. Была ўнесена прапанова аб абмене навуковымі артыкуламі.

Асаблівасцю выдання з'яўляецца тое, што яно ў розьнічны продаж не паступае, а распаўсюджваецца толькі па падпісцы.

Часопіс выдаецца ў чатырох серыях. Усяго выходзіць 12 нумароў у год — па 3 нумары кожнай серыі.

Для даведкі. Серыя І. Індэкс 74851. Фізіка, матэматыка, механіка. Кошт — 2.85. Серыя ІІ. Індэкс 74852. Хімія, біялогія, геаграфія. Кошт — 2.55. Серыя ІІІ. Індэкс 74853. Гісторыя, філасофія, навуковы камунізм, эканоміка, права. Кошт — 2.40. Серыя IV. Індэкс 74854. Філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія. Кошт — 2.40.

Падпіску можна аформіць у любым паштовым аддзяленні.

**П. БАРАНОЎСКІ,**
адказны сакратар «Весніка БДУ імя У. І. Леніна».

# Твой субяседнік — газета «Звязда»

ГАЗЕЦЕ «Звязда» — семдзесят гадоў. Яна — старэйшая партыйная газета Беларусі. Яе арганізатарамі і першымі рэдактарамі былі вядомыя бальшавікі-ленінцы М. Ф. Фрунзе і А. Ф. Мяснікоў. У гады Вялікай Айчыннай вайны выдавалася ў падполлі і партызанскай зоне.

Паважаныя таварышы!

Калі Вы хочаце ведаць пра важнейшыя падзеі жыцця рэспублікі, іх прынцыповую ацэнку, калі Вас цікавіць паглыблены аналіз падзей за мяжой, навіны навукі, тэхнікі, медыцыны, пытанні сацыяльнай справядлівасці, шляхі вырашэння сацыяльных праблем і г. д., раім Вам выпісаць нашу газету. Падпіска прымаецца на наступны год да 1 лістапада г. г. Кошт — 7 руб. 80 кап.

**Рэдкалегія газеты «ЗВЯЗДА».**

## НЕКАЛЬКІ КАРЫСНЫХ ПАРАД

# Як пазбегнуць стрэсу

ШМАТ ГАДОЎ назад стваральнік тэорыі стрэсу, вучоны з сусветным прызнаннем Ганс Селье выказаў думку, якая можа дапамагчы, калі што-небудзь пагражае душэўнай раўнавазе ці ўзнікаюць сумненні ў правільнасці сваіх паводзін. Вось яна: «Імкніся да вышэйшай з даступных табе мэт і не ўступай у барацьбу з-за дробязей».

Асабліва шкодны стрэс няўдач і марных надзей. Чалавек з яго высокаразвітай нервовай сістэмай вельмі чуллівы да такой псіхічнай траўмы. Аднак ёсць пэўныя парады, якія дапамагаюць у цяжкіх сітуацыях. Некаторыя з іх рэкамендаваў сам Селье. Можаце выбраць тое, што вам найбольш падыходзіць:

— пастулайце з іншымі так, як вы жадалі б, каб яны паступалі з вамі;

— прызнайце, што дасканаласць немагчыма, аднак у кожным відзе дасягненняў ёсць свая вяршыня, да якой неабходна імкнуцца;

— цаніце радасць сапраўднай прастаты жыццёвага ўкладу. Пазбягаючы ўсяго наўмыснага, паказнога, вы заслужыце прыхільнасць і любоў тых, хто вас акружае;

— з якой бы жыццёвай праблемай вы ні сутыкнуліся, узважце спачатку, ці каштуе яна таго, каб уступаць у барацьбу;

— пастулова сканцэнтроўвайце ўвагу на светлых баках жыцця. Мудрая прыказка гаворыць: «Бяры прыклад з сонечных гадзіннікаў — вядзі лік толькі радасным дням»;

— нішто не збянтэжвае больш, чым няўдача, нішто не падбадзёрвае мацней, чым поспех. Нават пасля знішчальнага паражэння змагацца з прыгнятаючай думкай аб няўдачы лепш за ўсё з дапамогай успамінаў пра поспехі. Гэта вельмі дзейсны сродак аднаўлення веры ў сябе, неабходнай для будучых перамог. Любому чалавеку ёсць пра што ўспомніць з гонарам;

— калі вас чакае засмучаючая непрыемная справа, не адкладывайце яе: ускрыйце нарыў, каб хутчэй пазбавіцца ад болю;

— каб навучыцца расслабляцца, карысна авалодаць прыёмамі аўтагеннай трэніроўкі. У гэтым вам дапамогуць псіхатэрапеўты.

Нарэшце, не забывайце, што няма гатовых рэцэптаў на ўсе выпадкі жыцця.

**В. РАПАВЕЦ,**
урач гарадскога кардыёдыспансера.

## УЛАСНЫ СВЕТ





# Ад вучня — да майстра

— Не моргайце... Увага. Гатова,— і сонны фатограф у чорным пакамечаным халаце, страціўшы да вас інтарэс, паклікаў:

— Наступны!..

МЫ ўжо неяк звykліся з тым, што фотакарткі, якія пры неабходнасці робім у фотаатэльe, рэдка прыводзяць нас у захапленне. Удачай лічым, калі можна абмежавацца адным візітам: не задавальняюць ні якасць, ні, галоўнае, «папяровы твар» (няўжо я такі і ў жыцці несімпатычны?).

Не ведаю, як вам, а мне пасля чарговай сапсаванай карткі прыйшла думка, што ў фотаатэлье працуюць ці часовыя людзі, ці тыя, каму не пашанцавала, няўдачнікі.

Са сцен ГПТВ-12 бытавога абслугоўвання насельніцтва выходзяць, на шчасце, не толькі такія гора-майстры. Для іншых вучылішча з'яўляецца толькі першай прыступкай у ажыццяўленні мары — стаць сапраўдным фатографам. Як, напрыклад, для майго добрага знаёмага Дзімы Вількіна.

Да паступлення ў вучылішча Дзіма, з яго слоў, меў даволі слабае ўражанне, што такое фотаапарат і што з ім рабіць — ні яго знаёмыя, ні родныя гэтай справай не захапляліся. І ўсё-такі ён зрабіў правільны выбар. Вучыўся лёгка, «пяцёркі» былі звычайнай адзнакай. Для дыплома абраў складаную тэму: «Фотаграфіка». Можна сказаць, вывучэнне тэмы працягваецца — вось ужо чатыры гады Дзіма працуе вучэбным майстрам па фатаграфіцы на кафедры нагляднай агітацыі ў тэатральна-мастацкім інстытуце.



Чаго хоча Дзіма ад сябе? Скончыўшы вучылішча, зразумеў, што адукацыя на гэтым не канчыцца, захацеў і паступіў на аддзяленне журналістыкі завочнага факультэта БДУ. Праўда, заняткі па фотасправе трохі расчаравалі. Заданні для ўсіх аднолькавыя, без уліку падрыхтоўкі, здольнасцей, а галоўнае, хто не ўмеў трымаць фотаапарат у руках, так часцей за ўсё ніколі за яго і не возьмецца...

— Што Дзіма любіць больш за ўсё здымаць?

— Усё. Але не ўсё атрымліваецца.

Калегі-аднакурснікі лічаць, што здыманне рэпартажаў для яго — складаная задача. Лепш за ўсё ў Дзімкі атрымліваецца работа ў іншых жанрах: партрэце, пейзажы, эцюдзе... А можа, у гэтым яго перавага, а не абмежаванасць?

Разглядаць яго фотаздымкі — заўсёды задавальненне. Яму ўдаецца перадаць не толькі стан, настрой, падкрэсліць, вызначыць галоўную рысу героя, але і надаць пры гэтым сваё бачанне свету, свае рысы натуры: лірычнасць, прыхільнасць да роздуму, неметуслівыя адносіны да жыцця. Тады і атрымліваецца, на мой погляд, не проста фотаздымак, а фотакарціна (да таго ж высокі ўзровень яе тэхнічнага выканання). Сам Дзімка лічыць, што ён здымае «звычайна». І ў гэтым адказе праглядвае яшчэ адна яго адметная рыса — сціпласць.

— Дзіма, чаго ты хочаш ад сабе як фатографа?

— Стаць вялікім. Мець поспех. Каб людзі глядзелі мае здымкі і адразу пазнавалі: гэта Вількін. Не, не пішы, жартую. А калі сур'ёзна... Проста вельмі прыемна, няхай прагучыць банальна, несці ў свет сваю, маленькую радасць. Прыемна, калі партрэт падабаецца не толькі мне, а, галоўнае, майму герою...

Летась Д. Вількін быў узнагароджаны дыпломам III ступені на Усесаюзным конкурсе «Наша жыццё» (за серыю партрэтаў).

**А. ВІХРОВА,**
наш кар.

Фота Д. ВІЛЬКІНА.








БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
15 кастрычніка 1987 г.
Зак. 1590.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара З. А. АЛЯШКЕВІЧ.